Пахомова Елизавета Вячеславовна

Адзінства

Адзінства ў кожнага, мабыць, сваё,
Дзе бусел будуе ўвесну гняздо,
Дзе позірк пяшчотны маці тваёй,
На свята збіраюцца дружнай сям'ёй.

А іншы ўбачыць адзінства ў зямлі,
Нядаўна ўспаханай мокрай раллі,
У ветках і травах на полі шырокім,
Пад сінім і чыстым небам высокім.

Мы бачым адзінства ў памяці нашай,
У кожнай часіне цяжкой ці найлепшай,
У подзвігах продкаў, што мір збераглі,
Каб разам мы з вамі шчасліва жылі.

Мы – розныя вельмі, ды корань – адзіны,
Ён у вершах Купалы і кнігах Скарыны.
Галоўнае – разам па свеце ідзём
і справімся разам з любою бядой!